# СТАСУНКІ ПАШЫРАЮЦЬ ІНФАРМАЦЫЙНУЮ ПРАСТОРУ

Нацыянальныя бібліятэкі Беларусі і Польшчы падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве

Свае подпісы пад пагадненнем паставілі дырэктары бібліятэк — з беларускага боку Раман Матульскі, з польскага — Тамаш Макоўскі. Сама цырымонія падпісання адбылася ў будынку Нацыянальнай бібліятэкі Польшчы.

Дакумент заключаны на бліжэйшыя пяць гадоў і з'яўляецца прадаўжэннем раней падпісаных пагадненняў аб супрацоўніцтве паміж нацыянальнымі бібліятэкамі дзвюх краін. Гэта, у прыватнасці, прадугледжвае пашырэнне кнігаабмену паміж установамі, стварэнне сумесных бібліяграфічных баз дадзеных, развіццё інфармацыйнай прасторы, абмен вопытам і рэалізацыю сумесных праектаў.

Як адзначыў Тамаш Макоўскі, Нацыянальная бібліятэка Польшчы супрацоўнічае з аналагічнымі ўстановамі ў многіх краінах, аднак кантакты з беларускай Нацыянальнай бібліятэкай маюць вялікае значэнне. "З Беларуссю нас аб'ядноўвае агульнае мінулае: у Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве знаходзяцца фонды, якія з'яўляюцца часткай беларускай гісторыі, і, наадварот, у бібліятэцы ў Мінску ёсць фонды, якія маюць цікавасць для польскага боку. Спадзяюся, што пагадненне ўмацуе кантакты паміж нашымі ўстановамі", — сказаў кіраўнік галоўнай бібліятэкі Польшчы.



На думку Рамана Матульскага, супрацоўніцтва паміж нацыянальнымі бібліятэкамі дзвюх краін мае значэнне ў агульнаеўрапейскім маштабе. "Паміж народамі Беларусі і Польшчы існуюць даўнія цесныя сувязі. Я не ўяўляю далейшага развіцця еўрапейскай інфармацыйнай прасторы ў бібліятэчнай справе без супрацоўніцтва паміж Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі і Нацыянальнай бібліятэкай Польшчы", — дадаў дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

**"З Беларуссю нас аб'ядноўвае агульнае мінулае: у Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве знаходзяцца фонды, якія з'яўляюцца часткай беларускай гісторыі, і, наадварот, у бібліятэцы ў Мінску ёсць фонды, якія маюць цікавасць для польскага боку"**

Супрацоўніцтва галоўных бібліятэк краін-суседзяў працягнула міжнародная навуковая канферэнцыя пад назвай "Кніжныя фонды нясвіжскай бібліятэкі Радзівілаў". У форуме прынялі ўдзел спецыялісты з Беларусі, Польшчы, Літвы, Расіі і Украіны.

Канферэнцыя запланавана праграмай маштабнага міжнароднага праекта "Радзівіліяна" па электронным аб'яднанні архіваў роду Радзівілаў, якія знаходзяцца ў розных краінах. Старт гэтаму праекту быў дадзены ў пачатку гэтага года на пасяджэнні міжнароднай камісіі пры падтрымцы ЮНЕСКА. Нацыянальныя бібліятэкі Беларусі і Польшчы з'яўляюцца вядучымі ўдзельнікамі праекта, бо ўстановы ў Варшаве і Мінску — асноўныя фондатрымальнікі дакументальнай спадчыны Радзівілаў.

Ірына **Трафілава**